тэатр. формай. Стварыў такія разнастайныя характары, як барон фон Рылькен («Паміж ліўнямі» А.Штэйна) і салдат Сударыкаў («Перабежчык» А. і П. Тур), французскі генерал Жабер («Алека Дундзіч» М.Каца і А.Ржашэўскага) і падпольшчык Арлоў («Простая рэч» паводле Б.Лаўранёва), адвакат Дубравін («Вогненны мост» Б.Рамашова) і Хромчанка («Камуніст» Я.Габрыловіча), Ротмістр («Дамы і гусары» А.Фрэдры) і дыпламат О'Крэдзі («Дыпламат» С.Алёшына) і інш. Пачуццё рытму, музычнасць дазвалялі яму выконваць ролі сінтэтычнага плана ў муз. камедыях: Чыжоў («Раскінулася мора шырока» У.Азарава, У.Вішнеўскага і А.Крона) і Пчолкін («Марскі вузел» В.Віннікава і В.Крахта з муз. Я.Жаркоўскага). Асаблівай вастрынёй вонкавага малюнка вызначаліся такія персанажы, як Збышка («Мараль пані Дульскай» Г.Запольскай), Сіпаты («Аптымістычная трагедыя» Вішнеўскага), Князь К. («Дзядзечкаў сон» паводле Ф.Дастаеўскага). Сярод лепшых работ: Глап'е («Тысяча франкаў узнагароды» В.Гюго), Цыганоў («Варвары» М.Горкага) і Радзівон Мікалаевіч («Старамодная камедыя» Арбузава). З інш. роляў: Тузенбах («Тры сястры» А.Чэхава), Бублік («Платон Крэчат» А.Карнейчука), Платон Ангел («Дзікі Ангел» А.Каламійца), Баляснікаў («Казкі старога Арбата» Арбузава), Савіч («Сэрца на далоні» паводле І.Шамякіна), Альховік і Іахім («Трывога» і «Францыск Скарына» А.Петрашкевіча).

*А.А.Лабовіч.*



Будынак былой **Гродзенскай музычна-тэатральнай школы Тызенгаўза**.

**ГРО́ДЗЕНСКАЯ МУЗЫ́ЧНА-ТЭАТРА́ЛЬНАЯ ШКО́ЛА ТЫЗЕНГА́ЎЗА.** Існавала ў 1774—80 у Гродне. Створана падскарбіем надворным літ. А.Тызенгаўзам для задавальнення патрэб *Гродзенскага тэатра Тызенгаўза*. Працавала ў спец. будынку на Гарадніцы. Адкрыццю школы папярэднічала падрыхтоўка музыкантаў скрыпачом Гродзенскай капэлы Т.Вежбаловічам (дагавор з ім заключаны 24.6.1769). Навучаліся дзеці прыгонных сялян і мяшчан (ад 8—10-гадовага ўзросту), якіх падбіралі паводле муз. здольнасцей па загаду Тызенгаўза. Былі 3 класы. Вучні набывалі навыкі ігры на скрыпцы, альце, віяланчэлі, кантрабасе, віёле, флейце, габоі, кларнеце, фагоце, валторне, трубе, клавікордзе. У праграму заняткаў уваходзілі таксама спевы, танец, нотная грамата, тэорыя музыкі і кампазіцыя. Выкладаліся і некат. агульнаадукацыйныя прадметы (пісьмо, арыфметыка, франц. і італьян. мовы, рысаванне), рукадзелле; чыталіся лекцыі па выхаванні. Кіраўніком школы быў скрыпач і капельмайстар Л.Сітанскі, педагогамі — італьян. кампазітар К.Абатэ, польск. і бел. музыканты Д.Пташынскі, Б. і С. Сітанскія, А.Тумін, Геранім, Вежбаловіч, Е.Барковіч, Ф.Бірон, С.Швед, Я.Пашкоўскі, а таксама найб. здольныя вучні М.Гжанкоўскі, Ю.Вайткевіч, М.Яленіч, італьян. харэограф Г.Петынеці (1774—79). Школа давала добрую падрыхтоўку, яе вучні выступалі ў спектаклях тэатра (балеты Петынеці «Сялянскі балет», «Квартэт дудароў», «Балет пекараў», усе 1778). Выхаванцы школы — танцоўшчыкі Е.Валінскі, Д.Пякарская-Сітанская, М.Рымінскі, спявачка М.Сітанская праславіліся ў польск. тэатры. З адстаўкай Тызенгаўза ад усіх пасад (1780) школа пераведзена ў Паставы і існавала да яго смерці ў 1785. У гэты час рыхтаваліся пераважна танцоўшчыкі (16 дзяўчат і 18 юнакоў), а таксама вакалісты і інструменталісты. Танец выкладалі Ф.Г.*Ле Ду*, прыгонны танцоўшчык Рымінскі. Ставіліся школьныя балетныя спектаклі (балет Ле Ду «Гілас і Сільвія» паказаны ў 1785 у Варшаве).

*Літ.*: Prosnak J. Grodzieńska szkoła muzyczna w czasach Antoniego Tyzenhauza // Muzyka. 1969. № 2; Mamontowicz-Lojck B.Szkoła artystyczno-teatralna Antoniego Tyzenhauza, 1774—1785 // Rozprawy z dziejów oświaty Wrocław etc., 1968. T.11.

*Г.І.Барышаў, В.П.Пракапцова.*

**ГРО́ДЗЕНСКІ АБЛАСНЫ́ ДРАМАТЫ́ЧНЫ ТЭА́ТР.** Створаны ў вер. 1947 на базе пераведзенага ў Гродна *Бабруйскага абласнога драматычнага тэатра*. Маст. кіраўнік М.Кавязін (да 1950). Узначальвалі гал. рэжысёры: Ю.Юроўскі (1950), С.Рахманаў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ